**Пасяджэнне Міжведамаснага савета
па каардынацыі работы
з пацярпелымі ад гвалту ў сям'і**

У рамках правядзення рэспубліканскай прафілактычнай акцыі “Дом без гвалту!” 16 красавіка ў ДУ “ТЦСАН Ашмянскага раёна” адбылося пасяджэнне міжведамаснага савета па каардынацыі работы з пацярпелымі ад гвалту ў сям'і.

На парадак дня былі вынесены праблемныя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе рэалізацыі Пратакола міжведамаснага ўзаемадзеяння па аказанні дапамогі ахвярам гвалту ў сям'і, у тым ліку павышэнне эфектыўнасці выкарыстання рэсурсаў «крызіснага» пакою. Таксама членамі міжведамаснага савета былі выпрацаваны новыя формы ўзаемадзеяння па аказанні дапамогі ахвярам гвалту ў сям'і.

Рашэнні, прынятыя па выніках пасяджэння, накіраваныя на ўмацаванне міжведамаснага ўзаемадзеяння службаў і арганізацый раёна пры аказанні дапамогі ахвярам хатняга гвалту.



